Источник: "Веды" - 2012-10-29

# ВУЧОНЫ, ПЕДАГОГ, ЛІТАРАТАР

## да 100-годдзя з дня нараджэння Ю.С.Пшыркова

**Сучасныя багатыя фонды Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я.Коласа НАН Беларусі ўтрымліваюць вялікую колькасць надзвычай рэдкіх выданняў, у тым ліку інкунабул, калекцыю кніг са славутай бібліятэкі Радзівілаў, іншыя каштоўныя калекцыі і паасобныя кніжныя дакументы, а таксама асабістыя архівы вядомых вучоных, пісьменнікаў, мастакоў, грамадскіх дзеячаў, якія пакінулі значны след у гісторыі айчыннай навукі і культуры.**



Сярод іх пачэснае месца займае і архіў Юльяна Сяргеевіча Пшыркова (1912-1980) – руплівага даследчыка беларускай літаратуры, крытыка, заслужанага дзеяча навукі Беларусі, доктара філалагічных навук, прафесара, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі, якому ў гэтыя восеньскія дні споўнілася б 100 гадоў.

Ю.Пшыркоў вядомы як даследчык творчасці Якуба Коласа. Яго грунтоўныя навуковыя працы ўнеслі важкі ўклад у развіццё коласазнаўства. Вучоны быў першым сярод крытыкаў, хто належным чынам, аб'ектыўна ацаніў паэму «Новая зямля», аўтарам грунтоўнай манаграфіі «Якуб Колас. Жыццё і творчасць» (1951) і інш.

Вялікая заслуга належыць Ю.Пшыркову і ў глыбокім, аб'ектыўным і прынцыповым вывучэнні працэсу станаўлення беларускай прозы 1920-1930-х гадоў. Дзякуючы яго намаганням былі вернуты да жыцця многія імёны беларускіх пісьменнікаў, якія доўгі час неабгрунтавана замоўчваліся, і беларуская літаратура ўзбагацілася новымі цікавымі творамі.

Ю.Пшыркоў быў адным з аўтараў і рэдактарам саліднага навуковага выдання «Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры» (1977), за ўдзел у якім у канцы 1980 года яму было нададзена званне лаўрэата Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (пасмяротна).

Трыццаць пяць гадоў Ю.Пшыркоў аддаў працы ў Інстытуце літаратуры імя Я.Купалы НАН Беларусі, з іх звыш чвэрці стагоддзя, да дня раптоўнай смерці, плённа кіраваў сектарам дакастрычніцкай літаратуры і тэксталогіі. Пад яго кіраўніцтвам і пры непасрэдным удзеле рыхтаваліся і выдаваліся зборы твораў Я.Купалы, Я.Коласа, М.Багдановіча, К.Чорнага і іншых пісьменнікаў.

Самаадданая навуковая дзейнасць Ю.Пшыркова была высока адзначана ўрадам рэспублікі – у 1978 годзе яму было нададзена званне заслужанага дзеяча навукі. Сярод іншых узнагарод вучонага – ордэны Вялікай Айчыннай вайны II ступені, «Знак Пашаны», медалі.

Працу навукоўца Ю.Пшыркоў арганічна спалучаў з педагагічнай: выкладаў у БДУ, Мінскім педінстытуце, пісаў падручнікі па беларускай літаратуры для сярэдняй школы, студэнтаў ВНУ, рыхтаваў высокаадукаваных, рознабаковa развітых навукоўцаў, настаўнікаў, літаратараў.

Асабісты фонд Ю.Пшыркова налічвае 1.484 адзінкі захавання за 1861-1983 гады і ўтрымлівае цікавыя дакументы біяграфічнага, творчага, службовага характару, шырокую перапіску, рэдкія фатаграфіі, а таксама вялікую калекцыю персаналій, аўтографаў, іншыя дакументы.

Да юбілейнай даты ў ЦНБ НАН Беларусі на аснове шматлікіх архіўных матэрыялаў і друкаваных дакументаў з фонду аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў падрыхтавана цікавая, пазнавальная выстаўка, якая распавядае пра жыццёвы і творчы шлях юбіляра.

Сярод экспанатаў – рукапісы яго манаграфій, чарнавікі артыкулаў па пытаннях літаратуразнаўства, прысвечаных творчасці вядомых беларускіх пісьменнікаў Я.Купалы, М.Лынькова, У.Дубоўкі, М.Гарэцкага, А.Адамовіча, Я.Брыля і іншых, а таксама даследаванні, звязаныя з імёнамі А.Пушкіна, Т.Шаўчэнкі, І.Франко.

На выстаўцы шырока прадстаўлена друкаваная спадчына Ю.Пшыркова, а таксама дакументы аб яго жыцці і творчай дзейнасці: артыкулы вядомых літаратуразнаўцаў, артыкулы з энцыклапедычных даведнікаў, вершы, прысвечаныя вучонаму, кнігі з дароўнымі надпісамі.

Урачыстае адкрыццё юбілейнай экспазіцыі адбудзецца ў дзень нараджэння Ю.Пшыркова – 31 кастрычніка 2012 года а 15-й гадзіне.

**Марына ЛІС,**
**Таццяна ЖУК,**
**навуковыя супрацоўнікі аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ імя Я.Коласа НАН Беларусі**